Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛЮТАГА 2017 г. СЕРАДА № 31 (28395)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Памятаем паймённа

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў вайны ў Афганістане з нагоды Дня памяці.**

*«У Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў прыміце словы шчырай удзячнасці за доблесць, стойкасць і мужнасць, праяўленыя вамі ў гарачых кропках планеты. Мы памятаем паймённа і смуткуем аб сынах Беларусі, якія цаной уласнага жыцця пацвердзілі вернасць прысязе і воінскаму абавязку, схіляем галовы перад іх бацькамі, удовамі і дзецьмі», — адзначаецца ў звароце.*

*Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што толькі праз гады прыйшло сапраўднае разуменне значнасці тых, ужо далёкіх падзей. «У сучаснай гісторыі вы былі першымі, хто даў рашучы адпор міжнароднаму тэрарызму», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.*

*«Сёння воіны-інтэрнацыяналісты па-ранейшаму займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, добрасумленна працуюць на карысць роднай Беларусі. Дзякуй, што вы поруч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны працягваеце годна выхоўваць маладое пакаленне ў духу сапраўднага патрыятызму», — падкрэсліў Прэзідэнт.*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў**

*«Старшынства ў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве мае асаблівае значэнне для Беларусі. Як вядома, наша краіна заўсёды займала лідзіруючыя пазіцыі ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы, стоячы каля вытокаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Саюзнай дзяржавы, а таксама Еўразійскага эканамічнага саюза. Нягледзячы на тое, што не ўсе нашыя чаканні спраўдзіліся, мы застаёмся актыўнымі прыхільнікамі больш цеснай інтэграцыі ў рэгіёне ў імя нашага агульнага дабра».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8804 | ▼ |
| Еўра | 1,9956 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0691 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ 15 лютага — Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ГАНАРОВАЯ ВАРТА

**Вучні малодшых класаў сярэдняй школы вёскі Ленін Жыткавіцкага раёна каля мемарыяльнай дошкі з партрэтамі воінаў-землякоў Юрыя ГОРБАТА, Канстанціна МІХАЙЛОЎСКАГА і Івана ХАЦЯНОВІЧА, якія загінулі на афганскай зямлі.**

## ЗВЫЧАЙНАЯ АРМЕЙСКАЯ РАБОТА: 2 ГАДЫ, 2 МЕСЯЦЫ, 16 ДЗЁН

### Як былы афіцэр-дэсантнік стаў вучоным-матэматыкам

**У загадчыка кафедры вышэйшай матэматыкі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта нават падчас студэнцкіх канікулаў няма аднаснага зацішша: сесія завочнікаў, процьма арганізацыйных пытанняў, а яшчэ некалькі калег грыпуюць, даводзіцца тэрмінова знаходзіць падмену. Таму ўсё робіцца хутка, дакладна, без мітусні. Вайсковая жылка нікуды не дзелася. Хоць ваенную службу Леанід МАХНІСТ пакінуў ужо чвэрць стагоддзя таму.**

Леанід Пятровіч працуе на кафедры без малога 20 гадоў, з якіх восем кіруе ёй. За плячыма — абарона дысертацыі і больш за 150 навуковых і метадычных прац. А колькі студэнтаў прайшло праз яго рукі! У тэхнічнай ВНУ практычна ўсе матэматыку вывучаюць чатыры семестры — гэта адзін з галоўных прадметаў. Навуковая работа і работа з моладдзю цяпер сталі асноўным зместам жыцця былога афіцэра-дэсантніка.

Не, ён не рыхтаваў сябе да ваеннай службы і, здаецца, не асабліва марыў аб кар'еры вайскоўца. Хлопчык з Глыбокага Віцебскай вобласці пайшоў у школу ў шэсць гадоў. Рана навучыўся чытаць, пісаць, лічыць, а маці была настаўніцай, узяла і адправіла сына ў школу раней. А ў 16 гадоў Леанід стаў студэнтам мехмата БДУ. Пасля ўніверсітэта мог бы пайсці супрацоўнікам у які-небудзь даследчы інстытут ці ўладкавацца на прэстыжнае прадпрыемства. Але, паводле яго слоў, савецкага хлопца прыцягвала рамантыка вайсковага жыцця, яго марай было паслужыць у дэсантнай часці. Відаць, на гэта паўплывала біяграфія бацькі, франтавіка. Пётр Махніст на вайне служыў у палкавой разведцы.

СТАР. 4

■ Сацыяльны клопат

## АБ РЫНКУ ПРАЦЫ, ПЕНСІЯХ І ДАПАМОГАХ

### Рэструктурызацыя прадпрыемстваў павінна быць сацыяльна адказнай

**На выніковай калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, акрамя падвядзення вынікаў работы ў 2016 годзе, былі намечаны планы на гэты год. У адным з мінулых нумароў мы ўжо пісалі пра тое, якой будзе палітыка міністэрства ў сферы аплаты працы. Сёння гаворка пойдзе аб рынку працы, пенсіях і сацпадтрымцы.**

### ПЛАНУЕЦЦА СТВАРЫЦЬ 70 ТЫСЯЧ ДАДАТКОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ



Асаблівая ўвага была ўдзелена захаванню стабільнай сітуацыі на рынку працы ў краіне. «Не павінна быць пустых размоў пра тое, што аптымізацыя — гэта аўтаматычнае скарачэнне», — адзначыў, у прыватнасці, **віцэ-прэм'ер Васіль ЖАРКО.**

Між тым праведзеная ў краіне кадравая дыягностыка выявіла залішнюю колькасць працуючых у арганізацыях Беларусі на ўзроўні амаль 6%. І, як заявіў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ,** працэс рэструктурызацыі цягне за сабой вызваленне часткі работнікаў. «Да аптымізацыі трэба падыходзіць абдумана, — сказаў Андрэй Лабовіч. — Яна павінна быць сацыяльна адказнай. Там, дзе гэта трэба, мэтазгодна прыцягваць да вырашэння праблемы і ўлады, і бізнес, і прафсаюзы».

СТАР. 3